# *КУЛЬТУРОЛОГИЯ*

**УДК 008**

## КУЛЬТУРНАЯ КАМПЕТЭНЦЫЯ: СУЧАСНЫЯ ПАДЫХОДЫ

***канд. філал. навук, дац. Л.М. УЛАДЫКОЎСКАЯ***
***(Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы, Мінск)***

*Разглядаюцца паняцце, змест і практычнае значэнне культурнай кампетэнцыі ў сучасную эпоху глабальных сацыякультурных трансфармацый, актывізацыі міжкультурнага ўзаемадзеяння і шматгранных сацыяльных кантактаў. Акцэнтуецца ўвага на залежнасці зместу культурнай кампетэнцыі ад вызначэння культуры з пазіцыі розных перспектыў, кожная з якіх уяўляе сабою адпаведную сістэму сімвалаў, герояў, рытуалаў і каштоўнасцей. Раскрываюцца крытэрыі культурнай кампетэнтнасці чалавека, ці CQ (матывацыя, пазнанне, метапазнанне, паводзіны). Аўтар факусіруе ўвагу на нацыянальна-культурнай кампетэнцыі і яе значэнні для культурнай бяспекі нацыі і нацыябудавання. Паказваецца роля культурнай кампетэнцыі ў міжнароднай дзейнасці і ў палітыцы, культурнай дыпламатыі, бізнэсе, іншых сферах грамадскага жыцця і сацыяльнага супрацоўніцтва.*

***Ключавыя словы:*** *культура, глабалізацыя, культурная кампетэнцыя, міжкультурная камунікацыя, культурная ідэнтычнасць, нацыянальная бяспека*

**Уводзіны.** Сучасная глабалізацыя, якая нясе з сабой узмацненне культурнай узаемазалежнасці і пашырэнне культурных кантактаў, – гэта складаны і супярэчлівы працэс; ён суправаджаецца крызісамі, трансфармацыяй светапогляду, інавацыйнымі пошукамі ў кожнай культуры і т.п. Актуальнасць вывучэння культурнай кампетэнцыі абумоўлена не толькі актывізацыяй узаемадзеяння культур, рэзкім узмацненнем міграцыйных працэсаў, якія спарадзілі неабходнасць у новых формах міжкультурнага і міжэтнічнага ўзаемадзеяння, еўрапейскім крызісам мультыкультуралізму, але і запатрабаванасцю такога тыпу асобы, які валодае неабходным узроўнем талерантнасці, ведамі і навыкамі міжкультурных зносін, здольны эфектыўна пераадольваць міжкультурныя бар'еры ва ўмовах разнастайных міжкультурных і сацыяльных кантактаў. Сёння патрабуецца чалавек, чыя культурная кампетэнтнасць дазваляе шанаваць уласныя культурныя традыцыі і з пашанаю і разуменнем ставіцца да культурных традыцый іншых народаў, чалавек, які цэніць разнастайнасць, чыё мысленне адкрытае да дыялогу.

Нягледзячы на ўзрастанне ролі і значэння культурнай кампетэнцыі ў глабальным свеце і ў межах нацыянальнага жыцця, яна пакуль слаба даследавана ў беларускай гуманітарнай навуцы.

Мэта артыкула: прааналізаваць сучасныя падыходы да гэтага паняцця.

**Асноўная частка.** Сярод сямі соцень сучасных вызначэнняў культуры апошняя можа разумецца ў самым агульным выглядзе як інтэграваны ўзор чалавечых паводзін, што ўключае ў сябе думкі, дзеянні, звычаі, вераванні, каштоўнасці і інстытуты расавай, этнічнай, рэлігійнай ці сацыяльнай групы.

Можна вызначыць культуру з гістарычнай перспектывы як традыцыі для будучых пакаленняў; з біхеявірыстычнай перспектывы як пэўныя спосабы паводзін у жыцці; з перспектывы сімвалічнай як набор сімвалаў, зразумелы і прыняты ў грамадстве; з перспектывы структуральнай як сістэму ўзораў, ідэй, сімвалаў, паводзін; з перспектывы нарматыўнай як сістэму ідэалаў, каштоўнасцей, правілаў жыцця.

Слова "культура" асацыіруецца з калектыўным праграмаваннем мыслення (розуму), што адрознівае адну катэгорыю людзей ад іншай. "Катэгорыя людзей" можа быць нацыяй, рэгіянальнай ці этнічнай групай, мужчынскай або жаночай (гендэрная культура), старых або маладых (узроставая группа і культура пакалення), у залежнасці ад сацыяльнага класа, прафесіі або спецыяльнасці (прафесійная культура), тыпу бізнесу або арганізацыі (арганізацыйная культура), нават сям'і.

Культура складаецца з мноства элементаў, якія можна падзяліць на 4 групы: сімвалы, героі, рытуалы, каштоўнасці.

Сімвалы – гэта словы, аб'екты або жэсты, якія набываюць сваё значэнне па ўзгадненні. На ўзроўні нацыянальнай культуры сімвалы ўключаюць цалкам зону мовы, на ўзроўні арганізацыйнай культуры – абрэвіятуры, слэнг, дрэс-код і статусныя сімвалы.

Героі – гэта рэальныя або прыдуманыя людзі, памерлыя або жывыя, якія служаць мадэллю паводзін. Так, існуе ідэал супрацоўніка, ідэал менеджэра і т.п.

Рытуалы – гэта калектыўныя дзеянні, тэхнічна празмерныя, але з пункту гледжання культуры – істотныя. На ўзроўні арганізацыйным – гэта не толькі святкаванні, але сходы, планаванне, нефармальныя кантакты і інш.

Каштоўнасці рэпрэзентуюць найглыбейшы ўзровень культуры. Яны пашыраюцца пачуццямі, часта падсвядомыя і не адкрытыя для дыскусіі наконт таго, што ёсць добрае і што ёсць дрэннае, чыстае або бруднае, прыгожае або ўродлівае, рацыянальнае або ірацыянальнае, нармальнае або ненармальнае, натуральнае або парадаксальнае. Гэтыя пачуцці прысутнічаюць у большасці прадстаўнікоў культуры, прынамсі, у тых людзей, хто займае цэнтральныя, кардынальныя пазіцыі.

Адзначым, што нацыянальнасць (як і гендэр) не залежыць ад чалавека: кожны мае ментальнае праграмаванне пэўнай культуры ад нараджэння. Нацыянальныя культуры адрозніваюцца больш за ўсё на ўзроўні базавых каштоўнасцей, у той час як іншыя культуры адрозніваюцца значна больш павярхоўна (у асноўным сімваламі, героямі або рытуаламі). Нацыянальная культура пранізвае ўсе іншыя культуры, у якой жыве чалавек. У гэтай сувязі істотна, што культурная кампетэнтнасць (у плане нацыянальнай культуры) у значнай ступені ўласцівая чалавеку "ад прыроды" і не патрабуе яго асаблівых намаганняў (архетыпы, сімвалы-вобразы, гукапераймальныя словы, паняцці "дабра" і "зла" і іншыя элементы этнічнага і нацыянальнага светаўспрымання). З іншага боку, у сітуацыі размывання культурнай самабытнасці і празмерна моцнага ўплыву іншых культур культурная кампетэнцыя патрабуе пэўных высілкаў, накіраваных на грунтоўнае, прафесійнае засваенне "страчаных" або "схаваных" традыцый. Напрыклад, культурная кампетэнтнасць сённяшняга спецыяліста-гуманітарыя, які працуе ў Беларусі ці за мяжой, патрабуе вывучэння і ведання традыцый беларускай нацыянальнай культуры, асноўных беларускіх артэфактаў, беларускай гісторыі, мовы і інш. Веданне ўласнай культуры і быццё ў яе кантэксце (як і пашырэнне яе кантэксту) даюць чалавеку магчымасць у высокай ступені кампетэнтна меркаваць пра іншыя культуры і пры неабходнасці адаптавацца да іх, а таксама ажыццяўляць канструктыўнае міжкультурнае ўзаемадзеянне, годна прэзентуючы ўласную культуру, краіну і народ. Дыялог патрабуе, як мінімум, суб'ектаў, а для вядзення дыялогу культур неабходныя носьбіты культур.

Высокі ўзровень нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці таксама можа быць названы істотным элементам культурнай кампетэнцыі, асабліва ў Беларусі. Ён выступае важнейшым фактарам духоўна-культурнай бяспекі грамадства, базавым звяном захавання і развіцця беларускай культурнай самабытнасці [1]. У сваю чаргу нацыянальна-культурная бяспека, як аргументавана сцвярджае прафесар В. Пазнякоў, ёсць стан абароненасці дзяржавы і яе асноўных сістэм ад знешніх і ўнутраных пагроз, яна дазваляе развівацца стабільна і ўстойліва сацыякультурнай сферы грамадскага жыцця, уключаючы сферу культуратворчасці [2].

На нашу думку, культурная кампетэнцыя сёння патрабуе ўспрымання Беларусі не як культурнага маста паміж Захадам і Усходам, а як тыпалагічнай еўрапейскай краіны з уласцівай ёй культурай, гісторыяй, менталітэтам і іншымі асаблівасцямі. Гэта пры тым, што адзінства Еўропы выцякае не столькі з еўрапейскіх інстытутаў, сколькі са спосабу мыслення, сістэмы каштоўнасцей.

Як слушна заўважае вядомы сацыяльны антраполаг Гірт Хофстэдэ, першы дырэктар Інстытута даследаванняў міжнароднага супрацоўніцтва ў Нідэрландах, нават блізкія культуры значна адрозніваюцца паводле наступных паказчыкаў: "дыстанцыя ўлады" (ступень няроўнасці паміж людзьмі, што ўспрымаецца як норма); індывідуалізм; маскуліннасць, або ступень дамінавання "маскулінных каштоўнасцей" над фемміннымі (напорыстасць, прадукцыйнасць, поспех і суперніцтва); пазбяганне нявызначанасці; доўгатэрміновая арыентацыя (LTO: long-term orientation) з акцэнтам на беражлівасць і настойлівасць у супрацьлегласць кароткатэрміновай арыентацыі з акцэнтам на павагу да традыцый, спаўненні сацыяльных чаканняў [3].

Цікава, што ўсе ўсходнеазіяцкія краіны, якія апошнім часам цвёрда асацыіруюцца з высокім эканамічным ростам, маюць культуры LTO. Прафесар Гірт Хофстэдэ вывучыў 53 культуры паводле вышэйзгаданых параметраў і прыйшоў да высновы, што дыстанцыя ўлады вялікая ў Францыі і Партугаліі, калектывізм прэвалюе ў Партугаліі і Грэцыі; Аўстрыя і Італія надзвычай маскулінныя, у той час як Швецыя і Нідэрланды – фемінныя. Бельгія і Францыя пазбягаюць нявызначанасці, а Германія і ЗША лёгка яе прымаюць. Усе адрозненні ўплываюць на спосабы менеджменту ў гэтых краінах. Фемінныя культуры вельмі спачуваюць і сімпатызуюць слабым. Тыя, што пазбягаюць нявызначанасці, спрыяюць строгім правілам і прынцыпам, адваротныя ж схільныя да апартунізму і талеранцыі дэвіянтных паводзін [3].

Не толькі каштоўнасці і сацыяльная практыка, нават тэорыі з'яўляюцца прадуктам культурна дэтэрмінаванай сацыялізацыі. Катэгорыі, якімі мы мыслім, могуць быць несуадноснымі з рознымі асяроддзямі. Такое культурнае адрозненне стварае перашкоды на шляху камунікацыі і ўзаемаразумення, дыялогу і супрацоўніцтва. Менавіта культурная кампетэнцыя дазваляе зразумець і пераадолець рознасць у ладзе жыцця і думання, сістэмах каштоўнасцей і светаразумення. Культурная кампетэнцыя ўключае

ў сябе здольнасць чалавека да асобаснага росту шляхам бесперапыннага вывучэння і добрага разумення культурнай спадчыны, мудрасці і культурных каштоўнасцей, а таксама ўменне эфектыўна камунікаваць з людзьмі, якія належаць да розных культур. Вялікае значэнне маюць эстэтычныя і маральныя густы, эмацыянальная культура, для развіцця якой немалую ролю адыгрывае сацыялізацыя праз мастацкую культуру [4].

Паспяховасць узаемадзеяння чалавека з іншым культурным асяроддзем залежыць ад многіх фактараў. Па-першае, ад агульнай культурнай кампетэнтнасці чалавека, які ведае асаблівасці сваёй уласнай культуры, яе самабытнасць і выдатныя артэфакты і знаёмы з культурамі і традыцыямі іншых народаў. Культурная кампетэнцыя патрабуе камунікатыўных здольнасцей, яна падразумевае таксама валоданне культурай зносін і асновамі дыялагічнага мыслення. Іншымі словамі, міжкультурныя кантакты патрабуюць наяўнасці неабходных тэарэтычных ведаў, псіхалагічных якасцей і практычных навыкаў, змястоўную сукупнасць якіх і можна вызначыць тэрмінам “культурная кампетэнцыя”.

Слова “кампетэнцыя” выкарыстоўваецца звычайна для абазначэння здольнасці эфектыўна функцыянаваць. Хаця на сённяшні дзень не існуе адзінай дэфініцыі культурнай кампетэнцыі, але калі прааналізаваць розныя падыходы да культурнай кампетэнцыі, выпрацаваныя цягам апошніх 15 гадоў, то яе можна вызначыць як *сукупнасць пэўных мадэляў паводзін, адносін і стратэгій, якія ствараюць адзіную сістэму эфектыўнай працы ў пэўным культурным асяроддзі ці ў кроскультурных сітуацыях.*

Паколькі культурная кампетэнцыя – гэта перш за ўсё ўменне адаптавацца і эфектыўна працаваць у розных культурных асяродках, то яна патрабуе прытрымлівацца некалькіх асноўных прынцыпаў: прызнанне каштоўнасці разнастайнасці, здольнасць да культурнай самаацэнкі, усведамленне дынамікі культурнага ўзаемадзеяння, наяўнасць інстытуцыяналізаваных культурных ведаў.

Першапачаткова паняцце “культурная кампетэнцыя” і абрэвіятура “CQ” (англ. *cultural quotient, каэфіцыент культурнага развіцця* – тэрмін, які выкарыстоўваецца ў дзейнасці ўрада развітых краін, у бізнэсе, адукацыі і навуковых даследаваннях) былі вынайдзены ў працэсе навуковых даследаванняў Суна Анга і Лін Ван Дына, прысвечаных асноўным спосабам вымярэння і прагназавання кроскультурнай прадукцыйнасці [5]. Больш дэтальна канцэпт распрацаваў Дэвід Лівермор [ 6].

Культурная кампетэнтнасць (або CQ) вымяраецца па аналагічнай шкале, выкарыстанай для вымярэння каэфіцыента інтэлекта індывіда (IQ). Людзі з больш высокім CQ валодаюць большай здольнасцю паспяховага адаптавання ў любым асяроддзі, выкарыстоўваюць больш эфектыўныя метады вядзення спраў, чым людзі з ніжэйшым CQ. Узровень CQ вымяраецца з дапамогай акадэмічна зацверджанай сістэмы ацэнкі Лін Ван Дына і Сун Анга.

Анг, Ван Дын і Лівермор апісваюць чатыры крытэрыі CQ: матывацыю (CQ Drive), пазнанне (CQ Knowledge), метапазнанне (CQ Strategy) і паводзіны (CQ Action). Ацэнка CQ паказвае вынікі ўсіх чатырох крытэрыяў, а таксама шэраг дапаможных паказчыкаў кожнай магчымасці [6 ].

Матывацыя (CQ Drive), ці зацікаўленасць чалавека, уключае ў сябе ўласны інтарэс (атрыманне задавальнення ад культурнай разнастайнасці) і знешні інтарэс (здабыванне карысці з вопыту, які атрыманы пры культурнай разнастайнасці). Пазнанне (CQ Knowledge), ці веданне чалавека пра падабенства і адрозненне культур, уключае веды эканамічных і прававых сістэм (бізнэс), каштоўнасці, нормы сацыяльнага ўзаемадзеяння і рэлігійных перакананняў (міжасабовыя адносіны), веды аб правілах моў і правілах невербальных паводзін. Метапазнанне (CQ Stratagy) азначае сэнс і значэнне для чалавека пражытага ім вопыту і абагульняе дасведчанасць (веды пра культурную спадчыну – сваю і чужую), планаванне (распрацоўка стратэгіі да сутыкнення з культурнай разнастайнасцю) і праверку, калі фактычны досвед адрозніваецца ад чаканняў. Паводзіны (CQ Action), ці магчымасць чалавека адаптаваць вербальныя і невербальныя веды, прадугледжваюць наяўнасць featured рознабаковага рэпертуару рэакцый на сітуацыі знаходжання ў іншакультурным асяроддзі.

Сёння вывучэннем і вымярэннем CQ, а таксама прымяненнем культурнай кампетэнцыі займаюцца Цэнтр культурнай кампетэнцыі (ЗША, штат Мічыган) і Наньянг бізнэс-школа (Сінгапур). Паняцце “культурная кампетэнцыя” выходзіць за межы ўсё больш папулярнага тэрміну “кроскультурная кампетэнцыя”, бо можа разглядацца як частка інтэлекту, якую можна вымераць і развіць. Згодна з Эрлі, Ангам і Ван Дынам, культурная кампетэнцыя вызначаецца як «здольнасць чалавека адаптавацца пры ўзаемадзеянні з прадстаўнікамі розных культурных рэгіёнаў» і мае паводніцкія, матывацыйныя і метакагнітыўныя аспекты [7].

Без культурнай кампетэнцыі дзелавыя, ваенныя і іншыя кантакты з прадстаўнікамі розных культур і сацыяльных груп падаюцца малаэфектыўнымі [8].

Культурная кампетэнцыя, напрыклад, у бізнэсе ўплятаецца ў тэорыю менеджменту і ў арганізацыйную псіхалогію. Разуменне ўплыву культурных традыцый індывіда на яго паводзіны мае важнае значэнне для эфектыўнага вядзення бізнэсу, а таксама для паспяховага ўзаемадзеяння ў любым

сацыяльным асяроддзі. Важна, аднак, умець адрозніць паводзіны, абумоўленыя культурай, ад індывідуальных паводзін і асаблівасцей характару чалавека. У палітычным і ваенным сэнсе культурная кампетэнцыя патрабуе ведаў па антрапалогіі, псіхалогіі, камунікацыі, сацыялогіі, гісторыі, геапалітыцы, разумення ваеннай дактрыны і інш.

Культурная кампетэнцыя мае вырашальнае значэнне для культурнай дыпламатыі, якая сёння ўяўляе ажыўленую інавацыйную сферу даследавання, мае сваю аўтаномную тэорыю і практыку. Мяккая сіла ў сістэме глабальнай палітыкі здольная больш якасна ўздзейнічаць на чалавека, пераканаць праз культуру, каштоўнасці і ідэі, у супрацьлегласць жорсткай сіле, якая ўжывае вайсковую моц. Культурная дыпламатыя не другасная ў адносінах да палітычнай ці эканамічнай дыпламатыі, яна функцыянуе як унутраны і неабходны іх кампанент. Культурная дыпламатыя валодае ўнікальнай здольнасцю ўплываць на грамадскую думку і ідэалогію людзей, супольнасцей, культур і краін, дасягаючы паслядоўнай рэалізацыі некалькіх важнейшых прынцыпаў: павага і прызнанне культурнай разнастайнасці і спадчыны; глабальны міжкультурны дыялог; справядлівасць, роўнасць, узаемазалежнасць; абарона міжнародных правоў чалавека; глабальны мір.

У прыватным сектары бізнэсу культурная дыпламатыя набірае ўсё большыя абароты. Пры росце сацыяльнай інфармаванасці з культурна адчувальнымі маркетынгавымі планамі і кампаніямі карпарацыі набываюць станоўчую грамадскую ацэнку і непараўнальна большыя прыбыткі.

Калі міжкультурная камунікацыя патрабуе адкрытасці і гатоўнасці чалавека ўдзельнічаць у працэсе, разумення агульных рыс, адрозненняў і наяўнасці таго невядомага, што трэба пазнаваць і даследаваць, то культурная кампетэнцыя ўключае ў сябе меру гэтага разумення, а таксама павагу і прыняцце невядомага і іншага – галоўныя ўмовы развіцця ўзаемапрыязных міжкультурных стасункаў, абмену культурным досведам (але не замены аднаго досведу іншым). Узаемнасць і адкрытасць ураўнаважваюць магчымае небяспечнае дамінаванне таго ці іншага боку, у кожнага з якога ёсць уласная перспектыва, з якой мы спрабуем зразумець свет і сябе ў ім. Дзякуючы культурнай кампетэнцыі мы маем магчымасць у святле ўласных самаадчуванняў патлумачыць нашу выразнасць і ўзаемазалежнасць.

Культурная кампетэнцыя стварае агульнапаняційнае асяроддзе, у межах якога магчымыя камунікацыя і супрацоўніцтва носьбітаў розных культурных кодаў. Сутнасць міжкультурнай камунікацыі – у камунікацыйнай перспектыве, у патэнцыяле дыялога.

Надзвычай актуальны ў сучасную эпоху міжкультурны дыялог, які грунтуецца на культурнай кампетэнцыі, на вольным супрацоўніцтве як важным прынцыпе, які засноўваецца на раўнапраўі ўсіх культур і асоб, адмаўляецца ад культурнай ізаляцыі і культурнай выключнасці.

**Заключэнне.** Культурная кампетэнцыя стварае шэраг шматгранных магчымасцей. Напрыклад, увайсці ў культурную прастору, заняцца тым, што цікава іншай культуры, прысвяціць час сваёй уласнай культуры, адкрыццю сябе побач з іншымі. Калі кожны ўдзельнічае ў падзеях іншага, то суб’ектыўная рэальнасць кожнага павялічваецца. Безумоўна, складана весці дыскусію людзям, якія выхаваныя ў розных культурах, але няма нічога больш плённага, чым такая дыскусія, якая стымулюе вялікія інтэлектуальныя і творчыя рэвалюцыі.

Такім чынам, культурная кампетэнцыя – важнейшая ўмова паспяховага бізнэсу, эфектыўнай урадавай дзейнасці, міжкультурнай камунікацыі і міжнароднага супрацоўніцтва ў навуцы, адукацыі і іншых сацыякультурных сферах.

Сфармулюем нашы вывады:

1. Культурная кампетэнцыя – гэта веды пра сімвалы, рытуалы, герояў, іерархію каштоўнасцей той ці іншай культуры, а таксама практычныя навыкі іх прымянення. Ступень валодання згаданымі ведамі і навыкамі можна абазначыць як культурную кампетэнтнасць асобы.

2. Культурная кампетэнтнасць (CQ) па аналогіі з IQ мае сваю тэхналогію вымярэння і крытэрыі-паказчыкі: матывацыя, пазнанне, метапазнанне, паводзіны.

3. Культурная кампетэнцыя – неад’емнае патрабаванне да сучаснага чалавека незалежна ад таго, жыве ён у лакальным ці глабальным свеце, эфектыўна функцыянуе ў кантэксце ўласнай культуры ці ў іншакультурных асяродках, ажыццяўляе міжкультурную камунікацыю або вядзе міжкультурны дыялог ці пераважна замкнёны на адной сацыяльнай групе.

4. Нацыянальна-культурная кампетэнцыя – прыродная ўласцівасць чалавека, але ў сітуацыі нефункцыянавання (або няпоўнага функцыянавання) чалавека ў кантэксце ўласнай культуры яна патрабуе дадатковых высілкаў і намаганняў па засваенні яе сімвалаў, герояў, рытуалаў і каштоўнасцей, а таксама нацыянальнай мовы.

5. Нацыянальная ідэнтычнасць, нацыянальная духоўна-культурная бяспека, культурная самабытнасць, культурная дыпламатыя, культуратворчая дзейнасць, міжкультурны дыялог, любая міжнародная дзейнасць, гуманітарнае пазнанне ўвогуле засноўваюцца на культурнай кампетэнцыі.

ЛІТАРАТУРА

1. Владыковская, Л. Проблема национально-культурной идентичности современного белорусского общества в условиях глобализации / Л.Владыковская // Безопасность Беларуси в гуманитарной сфере: социокультурные и духовно-нравственные проблемы / под общ. ред. О.А. Павловской. – Минск : Бел. наука, 2010. – С. 346–354.
2. Позняков, В.В. Национально-культурная безопасность: сущность, структура, классификация угроз / В.В. Позняков // Безопасность Беларуси в гуманитарной сфере: социокультурные и духовно-нравственные проблемы / под общ. ред. О.А. Павловской. – Минск : Бел. наука, 2010. – С. 354–365.
3. Geert Hofstede (2004). Business Cultures. In Intercultural communication: a global reader / eited by Fred E. Jandt California State University, San Bernardino. – P. 8–12.
4. Гриценко, В.И. Культурная компетентность в контексте культурного разнообразия и лакунарности / В.И. Гриценко, Т.Ю. Данильченко // Научные ведомости Белгород. гос. ун-та. Сер. Философия. Социология. Право. – 2014. – № 9 (180) / Т. 28. – С. 66–83.
5. Ang & Van Dyne (2008). Handbook of Cultural Intelligence. ME Sharpe.
6. Livermore, David (2009). Leading with Cultural Intelligence. – New York : AMACOM.
7. Earley, P. Christopher (2002). Redefining interactions across cultures and organizations: moving forward with cultural intelligence. In B. M. Staw. Research in Organizational Behavior 24. R. M. Kramer. – Oxford : Elsevier. – P. 271–299.
8. Pilon, Juliana (2009). Cultural Intelligence for Winning the Peace. The Institute of World Politics Press. – P. 10.

*Поступила 07.09.2016*

## CULTURAL COMPETENCE: MODERN APPROACHES

***L. ULADYKOUSKAJA***

*The article “Cultural Competence: Modern Approaches” is devoted to the definition, content and practical sense of cultural competence in the modern era of global sociocultural transformation, intercultural communication, and social collaboration. The author focused her attention on the different approaches to culture which is a whole system of symbols, heroes, rituals, and values. Technology for Cultural Competence measurement (CQ Drive, CQ Knowledge, CQ Strategy, and CQ Action) is described in the article. The author shows the role of cultural competence in intercultural interaction, international activities, in politics, cultural diplomacy, business, and other social spheres. Cultural competence is vital for national identity, nation security and nation building.*

***Keywords**: culture, globalization, cultural competence, intercultural communication, cultural identity, and nation security*